МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК
Кафедра сацыяльнай камунікацыі

ШЫБЕКА Марыя Ганна Вітальеўна

# ПРАСОЎВАННЕ ПАСЛУГ ПАСАЖЫРАПЕРАВОЗАК У СЕТЦЫ ІНТЭРНЭТ

Дыпломная праца
АНАТАЦЫЯ
Спецыяльнасць 1-23 01 15 Сацыяльныя камунікацыі

Навуковы кіраўнік:
старшы выкладчык
І.Ф.Бурына

Мінск, 2025

# АНАТАЦЫЯ

Структура дыпломнай работы ўключае два раздзелы. У першым раздзеле прааналізаваны тэарэтычныя асновы прасоўвання паслуг у сетцы Інтэрнэт, разгледжаны асаблівасці і інструменты інтэрнэт-маркетынгу, а таксама этапы прасоўвання паслуг пасажыраперавозак. У другім раздзеле прадстаўлены кейс кампаніі "Intercars-Еўропа", апісана агульная характарыстыка кампаніі і яе стратэгіі інтэрнэт-прасоўвання. Асветлены метады аналізу рынку і канкурэнтаў, а таксама практычныя аспекты выкарыстання розных інструментаў інтэрнэт-маркетынгу. Разгледжаны рэкамендацыі па паляпшэнні стратэгіі прасоўвання і дасягненні ўстойлівага росту ва ўмовах канкурэнцыі. Аб'ём дыпломнай працы складае 43 старонкі і ўключае 1 малюнак, 2 дадаткі і 17 выкарыстаных крыніц.

Ключавыя словы: інтэрнэт-маркетынг, прасоўванне, мэтавая аўдыторыя, кантэнт-маркетынг, SEO, вірусны маркетынг, эфектыўнасць, стратэгіі.

Аб'ект даследавання дыпломнай працы – паслугі па пасажыраперавозках.

Прадмет даследавання дыпломнай працы – прасоўванне паслуг пасажыраперавозак у сетцы Інтэрнэт.

Мэта дыпломнай працы – аналіз прасоўвання паслуг пасажыраперавозак у сетцы Інтэрнэт.

Метадалагічную аснову дыпломнай працы склалі агульнанавуковыя метады: метад аналізу і сінтэзу, метад індукцыі і дэдукцыі, метад параўнання, апісальны метад, а таксама прыватнанавуковыя, якія выкарыстоўваюцца пры правядзенні сацыялагічных даследаванняў (інтэрв'ю).

У працэсе напісання дыпломнай работы былі атрыманы наступныя вынікі: прааналізаваны тэарэтычныя асновы інтэрнет-прасоўвання паслуг пасажыраперавозак; выяўлены ключавыя інструменты інтэрнэт-маркетынгу, такія як SEO, кантэксная рэклама і SMM; вызначаны асноўныя этапы распрацоўкі стратэгіі прасоўвання на прыкладзе кампаніі "INTERCARS-Еўропа"; праведзены аналіз бягучых трэндаў у інтэрнэт-прасоўванні і іх уплыў на эфектыўнасць бізнесу; дадзены рэкамендацыі па паляпшэнні інтэрнэт-стратэгій, у тым ліку павелічэнне інвестыцый у SEO і развіццё кантэнт-маркетынгу для павышэння канкурэнтаздольнасці кампаніі.

Навізна атрыманых вынікаў абумоўлена недастатковай інфармацыяй аб спецыфіцы інтэрнэт-прасоўвання паслуг пасажыраперавозак і аб тым, як сучасныя кампаніі могуць адаптавацца да ўмоў рынку, якія хутка змяняюцца.

Матэрыялы і вынікі дыпломнай працы былі атрыманы на падставе дакладных крыніц і самастойна праведзеных тэарэтычных і практычных даследаванняў.

Матэрыялы дыпломнай працы могуць прымяняцца для ўдасканалення інтэрнэт-стратэгій у кампаніі «Intercars», так і для іншых арганізацый, якія

займаюцца пасажыраперавозкамі, якія імкнуцца павысіць сваю канкурэнтаздольнасць у лічбавай прасторы.